# ЧЫТАНКА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І. К. КАНДРАЦЬЕВА

## Да 125-годдзя з выхаду ў свет



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта культуры і мастацтва,
доктар культуралогіі, прафесар

**У канцы XIX-пачатку XX стагоддзя беларуская педагагічная спадчына ўзбагацілася шэрагам цікавых дыдактычных прац, якія прызначаліся для вучняў пачатковай школы. Так, у 1906 г. К. Каставіцкі (Карусь Каганец) выдаў «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання», Э. Пашкевіч (Цётка) - «Першае чытанне для дзяцей беларусаў». Іх справу працягвае Якуб Колас, які ў 1910 г. стварае «Другое чытанне для дзяцей беларусаў». Але значна раней, у 1887 г., беларускім паэтам, пісьменнікам, перакладчыкам, гісторыкам Іванам Казіміравічам (Кузьмічом) Кандрацьевым была напісана і выдадзена аб'ёмная (241 старонка) кніга для пачатковага чытання з назвай «Хскра Божая».**

## Наш славуты суайчыннік

На жаль, велізарная мастацкая, навуковая і педагагічная спадчына нашага славутага суайчынніка дагэтуль застаецца па-за ўвагай айчынных даследчыкаў. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі маецца толькі сем кандрацьеўскіх прац. Для параўнання зазначым, што ў фондах Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі знаходзіцца больш за **70** літаратурных твораў **І**. К. Кандрацьева, у тым ліку і згаданая чытанка «Іскра Божая». Але перш чым перайсці да аналізу самой кнігі, пазнаёмім чытача з асобай Івана Казіміравіча.

Нарадзіўся ён **9 (21)** ліпеня **1849** г. у сяле Каловічы Вілейскага павета Віленскай губерні ў беднай сялянскай сям'І, Вучыўся ў Смаленскай школе кантаністаў **(1856-1858)**, затым у фельчарскай школе пры Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі. **З** сярэдзіны **1860**-х гадоў жыве ў ВІльнІ, пэўны час працуе ў канцылярыі папячыцеля Віленскай навучальнай акругі. Захапляецца тэатрам, паэзіяй, Тут пачынаецца і яго літаратурная дзейнасць. У **1868** г. у «Віленскім весніку» былі надрукаваны яго першыя вершы «Вільня **22**-га кастрычніка **1868** г.», «Прачысценская царква». У наступным годзе «Віленскі веснік» друкуе яшчэ шэраг вершаў маладога паэта («Вільня», «**3** кожным годам у краі нашым...», «**19** лютага», «**3** натуры»). Спрабуе сябе Іван Кандрацьеў таксама ў якасці драматурга. Піша вадэвіль «Валасны пісар, альбо Дзе хвост пачатак, там галава мачала», апублікаваны асобным выданнем. Хутка ўбачылі свет яшчэ два яго «драматычныя жарты» «Сцэнка на Віленскай таўкучцы» і «Гандаль у мястэчках Паўночна-Заходняга края». У **1872** г. у Расіі Камісіяй апекі аб рабочых і рамесніках праводзіўся конкурс п'ес для народных тэатраў, у якім удзельнічаў **І** наш суайчыннік, Па выніках конкурсу яго гістарычная драма «На Паволжы» прызнаецца лепшай, а яе аўтару прысуджаецца ВялікІ залаты медаль.

У **1872** г. **І**. К. Кандрацьеў пераязджае ў Маскву, дзе пачынаецца зорны час пісьменніка з народа, ён з галавой акунаецца ў літаратурнае жыццё. Працуе адначасова ў некалькіх рэдакцыях часопісаў і газет, выконваючы абавязкі сакратара, становіцца актыўным удзельнікам літаратурна-музычнага гуртка, створанага Іванам Сурыкавым для пісьменнікаў-самавучак з народа. Паэтычныя творы **І**. К. Кандрацьева склалі два зборнікі «Думы и были» **(1884) І** «Под шум дубрав» **(1897)**. У маскоўскі перыяд ім створана значная колькасць драматычных твораў (п'есы «Разлучница», «Легко отделался», «Березовая гать»), аднаактных «п'ес-жартаў» («Воевода Волчий Хвост», «На Плющихе», «Ради копеечки») і інш.

**3**-пад пяра Кандрацьева выйшла шэраг шырока вядомых да нашага часу гістарычных раманаў: «Гуны», «Драма на Лубянке», «Раскольничьи гнезда», «Салтычиха». Апошні твор перавыдаваўся **5** разоў!

**І**. К. Кандрацьеў - аўтар гістарычнага нарыса «Седая старина Москвы» на **700** старонках, які перыядычна выдаецца і ў нашы дні, прычым вялікім тыражом **(1999, 2006, 2008)**. Ім напісаны гістарычны даведнік «Маскоўскі Крэмль».

На працягу ўсёй сваей літаратурнай дзейнасці **І**. К. Кандрацьеў шмат і з



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

натхненнем пісаў для дзяцей. Апавяданні і вершы для дзяцей склалі асобны зборнік «Золотая струна» [3], папулярным у свой час было апавяданне «Степка-растрепка», дзе ў гумарыстычнай форме распавядаецца пра паходжанні маленькага свавольніка [9].

І. К. Кандрацьеў пісаў і апрацоўваў казкі. Частка народных казак увайшлі ў зборнік «Золотая струна». Папулярнымі да нашага часу застаюцца апрацаваныя ім вершаваныя народныя казкі «Снегурочка» [4] і «Сивка-Бурка вещая каурка» [5]. Дайшоў да сучаснага чытача і зборнік «Русские народные былины», якi быў апрацаваны І. К. Кандрацьевым і выдадзены ў 1884 г. [1]. У яго ўключаны папулярныя ў дзяцей быліны пра волата Чурылу, рускага асілка Кажамяку, волата Іллю Мурамца, баярына Калаварота, купца наўгародскага Садко. Значную цікавасць для экалагічнага выхавання мае кніга для першапачатковага чытання «В дружбе с природой» [6], засваенню гісторыі розных народаў спрыяе этнаграфічная дзіцячая гульня «Лото племен и народов» і інш.

У фондах Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі захоўваецца як рарытэт кніжка І. К. Кандрацьева для першапачатковага чытання «В дружбе с природой». У мастацкіх творах для дзяцей, вучэбнай літаратуры, займальных дзіцячых дапаможніках аўтар паўстае перад намі не толькі як майстар слова, але перш за ўсё як чалавек, якога хвалюе лёс падрастаючага пакалення, які шчыра імкнецца да таго, каб дзеці выраслі адукаванымі, выхаванымі, духоўна багатымі. У тэкстах дзіцячых твораў Кандрацьева выразна адчуваецца абвостраная цікавасць да асобы дзіцяці, яго ўнутранага свету, паважлівыя адносіны да дзяцінства, якія сталі дамінантай яго мастацкай творчасці.

Пісьменнік разглядаў чытанне мастацкіх твораў як важнейшы элемент выхавання падрастаючага пакалення. Аналіз зместу кандрацьеўскіх твораў для дзяцей сведчыць: пісьменнік быў перакананы, што эфектыўнасць працэсу навучання чытанню залежыць не толькі ад спосабаў чытання, але і ад самога матэрыялу. Ён патрабавальна ставіўся да падбору тэкстаў, прапанаваных для чытання дзецям. Прыкладам такіх адносін з'яўляецца «Іскра Божая». Тэксталагічны аналіз твораў, уключаных у яе, сведчыць: яны складаюцца з цікавых мастацкіх тэкстаў, каб выклікаць у маленькіх чытачоў ахвоту да іх чытання. Гэтыя творы закраналі лепшыя струны душы, развівалі гатоўнасць стаяць за І грамадзянскія ідэалы, выхоўвалі спагадлівасць, і чуласць.

## Праваслаўная спадчына

Чытанка складаецца з шасці раздзелаў. Першы прысвечаны рэлігіі. Кандрацьеў быў перакананы ў тым, што праваслаўная спадчына валодае велізарным патэнцыялам духоўна-маральнага выхавання асобы, бо ўмацоўвае душэўныя сілы дзяцей і здольная супрацьстаяць злу, дазваляе вызначыць каштоўнасныя жыццёвыя арыенціры. Тэксты ў творах, якія раскрываюць сутнасць праваслаўнай веры, значэнне малітвы, хрысціянскіх каштоўнасцей, даступныя разуменню дзяцей, напісаны зразумелай мовай. 3 павучанняў протаіерэяў І. Раждзественскага і Р. Пуцяціна выбраны тэксты, цікавыя дзецям, яны сціслыя і звернуты менавіта да юных: «Когда Господь наш Иисус Христос жил на земле, Он очень любил детей за простоту их и незлобие: часто беседовал с ними и даже ставил их в пример взрослым. Любите же, дети, Спасителя нашего. Господа Иисуса Христа, всею силою нежных и добрых сердец ваших; Вспоминайте чаще о Нем, как о вашем благодетеле, и молитесь ему усердно каждый день» [2, с. б].

Роля, месца і пабудова хрысціянскага храма тлумачыцца цікавымі тэкстамі Ф. Бялюсціна. Шмат у дадзеным раздзеле вершаў вядомых рускіх паэтаў, у якіх увасабляецца шэраг рэлігійных таінстваў, дзеянняў вернікаў. Так, аўтар перадае змест малітвы падчас паста вершам А. Пушкіна «Великопостная молитва», тлумачэнне Дабравеста абапіраецца на вершы А. Талстога і І. Аксакава [2, с. 11]. Пачуцці вернікаў у Вялікую суботу перадаюцца вершам В. Жукоўскага «Вечер в субботу». Даступнасць дзецям зместу асноўных псалмоў забяспечваецца пры дапамозе вершаў А. Мея І М. Языкава [2, с. 18].

Разуменнем І. К. Кандрацьевым ролі хрысціянскіх каштоўнасцей у працэсе духоўна-маральнага выхавання дзяцей тлумачыцца той факт, што значная частка чытанкі адведзена разгляду важнейшых з іх. Жывой і яркай, а не казённай мовай распавядае пісьменнік дзецям пра міласэрнасць, рахманасць, спачуванне, пакорлівасць, паслухмянасць і іншыя праваслаўныя каштоўнасці, прыводзячы ў прыклад адпаведныя учынкі асоб, якія жылі ў розныя гістарычныя эпохі. Напрыклад, каб растлумачыць сутнасць міласэрнасці дзецям, пісьменнік уключыў у кніжку гісторыю пра Філарэта Міласэрнага: «Напали неприятели на страну, где жил Филарет Милостивый, и ограбили жителей той страны. У Филарета осталось всего имущества - два рабочих вола, одна лошадь и корова с теленком. По доброте своей роздал Филарет неимущим волов и лошадь. Тогда приходит к нему еще один бедный. Филарет не отказал и ему. Отдал ему теленка.

Не успел бедняк отойти от двора Филарета шагов на пятьдесят, как корова встосковалась по теленке своем. Жена Филаретова вышла унять корову, но не могла никак ее успкоить. Мычит корова, да так жалобно, что у всех сердце надрывается. Стала жена пенять Филарету: «И что это ты все у своих отнимаешь, а чужим раздаешь?» Слышит Филарет, а сам молчит и прислушивается: очень жаль ему коровы; изведется она с тоски без теленка, да и теленку без нее не прожить. Пошел он вдогонку за нищим, воротил его. Обрадовалась корова, лижет теленка, а он прямо к вымени. Обрадовалась и жена Филаретова: думала, что теленок во дворе останется; обрадовался и Филарет Милостивый, глядя на корову с теленком.

Не радовался только бедняк, думая, что теленка у него отобрали. Но не то было на уме у Филарета. Когда теленок насосался вдоволь, он погладил его, потрепал корову; потом сказал нищему: «Возьми вместе с теленком уж и корову: так лучше будет» [2, с. 26-27].

У гэтай жа частцы кнігі чытач можа пазнаёміцца з учынкамі св. Яфрэма, ігумена Феадосія, Іаана Багаслова, вучня св. Ісідара. 3 любоў'ю і вялікай павагай Кандрацьеў распавядае дзецям пра дзеянні св. Кірыла і Мяфодзія. У нарысе пра стваральнікаў славянскай пісьменства ўтрымліваецца шмат гістарычных ведаў. Даступнай мовай распавядаецца дзецям пра паходжанне славян, падзел іх на заходнюю, паўднёвую і ўсходнюю часткі. Тут даецца кароткая інфармацыя пра ўтварэнне славянскіх дзяржаў, узаемаадносіны з суседнімі народамі. Эмацыянальна распавядаецца пра жыццё Кірыла і Мяфодзія, іх здольнасці да навукі, маральнае аблічча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У храналагічным парадку падаецца гісторыя хрышчэння балгар, мараўскіх і чэшскіх славян, палякаў, сербаў, харватаў, хазараў, якіх хрысцілі Кірыла і Мяфодзій. Падрабязна разглядаецца дзейнасць братоў па стварэнні стараславянскага пісьменства і перакладу на яе Свяшчэннага пісання. У аналізуемай частцы кніжкі дзеці знойдуць звесткі аб **12** найбольш важных хрысціянскіх святах, іх паходжанні, значэнні і рытуальных дзеяннях падчас кожнага.

Такім чынам, жанрава разнастайныя творы першага раздзела чытанкі паказваюць дзецям Бога, блізкага ім і падобнага да чалавека. У тэкстах, якія змясціў у кніжцы Кандрацьеў, дзеці бачаць Бога, які сышоў на Зямлю, каб падзяліць з людзьмі радасці і пакуты. Бог паўстае не толькі як пакаральнік грэшнага чалавека, але і як выратавальнік асобы ад маральнага разлажэння, духоўнай дэградацыі. Пісьменнік пераканаўча паказвае, што вера - гэта не проста перакананне ў існаванні Бога: гэта асаблівы духоўна-маральны характар усяго ладу жыцця чалавека: «Желаете ли вы, чтобы и вам на земле было хорошо и весело, чтобы вас осиял свет божественный? Живите между собой в любви и согласии, и вам будет хорошо и весело, и вы будете жить в свете божественном» **[2**, с. **37]**.

## Гісторыя краіны

Другі раздзел кнігі для пачатковага навучання - «История». Сюды ўключаны тэксты з паданняў, былін, летапісаў, сачыненняў вядомых рускіх гісторыкаў, паэтычных і празаічных мастацкіх твораў знакамітых рускіх паэтаў, у тым ліку і самога Кандрацьева. Гэта частка пачынаецца з выказвання мітрапаліта Філарэта аб дзяржаве і яе сутнасці. Абапіраючыся на сачыненне У. Даля, пісьменнік даходліва тлумачыць дзецям, што такое Айчына і падмацоўвае свае высновы вершам **І.** Нікіціна «Русь» **[2**, с. **4]**. Тут жа прыводзіцца шмат пагаворак аб адданасці роднай зямлі: «Родная сторона - мать, чужая - мачеха»; «Чужая сторона и без ветра сушит» і інш.

У параграфе «Айчына» маюцца дакладныя звесткі аб плошчы Расійскай дзяржавы, яе адміністрацыйным падзеле, народах, якія насяляюць яе, канфесіях. Пасля агульнага агляду Расійскай імперыі ў храналагічным парадку прасочваецца яе палітычная і сацыяльная гісторыя. **І.** К. Кандрацьеў прытрымліваецца варажскай канцэпцыі паходжання славянскай дзяржавы. Аўтар чытанкі дакладна апісвае побыт усходніх славян, гаспадарчую дзейнасць, язычніцкую рэлігію, перадае легенду аб запрашэнні на княжанне варажскіх князёў **[2**, с. **51]**.

Гісторыя заснавання Кіева пачынаецца з падання аб устанаўленні крыжа св. апосталам Андрэем на беразе Дняпра і яго прадказанні аб узнікненні на гэтым месцы горада з мноствам хрысціянскіх храмаў. На падставе дадзенага падання **І.** К. Кандрацьеў напісаў верш, які таксама надрукаваны ў параграфе: *Учив религии Христовой В стране Болгарии суровой, Андрей, Апостол, брат Петра, Местами вольными Днепра, Его широкими водами Шел в Рим, - и на пути святом, Святый, он там с учениками Остановился под горами На берегу Днепра крутом. И, там восстав зарею ранней, Простер свои он к небу длани, И к ним подняв свой думный взор, Вещал: «На выси этих гор И загремит, и воссияет Святая Божья благодать: Здесь поселится Божья рать, Здесь солнце радостно взыграет, И здесь на диво возгорят Кресты церквей огнем обильным, Творцом воздвигнуты Всесильным!» Вещал - и высь благословил, И крест на ней он водрузил* **[2**, с. **52]**.

Хрысціянізацыю ўсходніх славян Кандрацьеў падае як прыкметную з'яву ў гісторыіі Расійскай дзяржавы. У кніжцы дзецям паказваюцца перавагі хрысціянскай рэлігіі над язычніцкай. Вучні даведваюцца, што хрысціянства спыніла чалавечыя ахвярапрынашэнні, умацавала сувязі Русі з іншымі дзяржавамі, спрыяла развіццю адукацыі, культуры. Афіцыйны тэкст пераплятаецца з вершамі А. Хамякова «Гой, красна земля Володимира» і «Киев».

У гістарычны раздзел уключаны шэраг паданняў аб барацьбе Кіеўскай Русі са шматлікімі ворагамі. Абапіраючыся на летапісныя тэксты, **І.** К. Кандрацьеў распавядае дзецям пра змаганне рускіх земляў з татара-манголамі і крыжацкімі ордэнамі. У тэкстах вылучаюцца месцы, дзе летапісцы гавораць пра мужнасць абаронцаў Айчыны. Напрыклад, эмацыянальна пададзены гераізм баярына Еўпація Калаўрата і яго дружыннікаў: «Долго не могло полчище Батыево управиться с полком Евпатиевым. Сам боярин, великан ростом, был силы непомерной. Тяжелым мечом он избил несметное число татар: одних перерубал пополам, других вдоль до самого седла рассекал. Битва кончилась только тогда, когда все удальцы легли мертвые. Батый дивился на таких воинов. Уважая доблесть их, он велел освободить тех, которые были захвачены в плен живыми» **[2**, с. **68]**. У кніжцы прыводзяцца паданні пра адданасць радзіме і хрысціянскай веры князя Міхаіла Чарнігаўскага, баярына Фёдара, якія не скарыліся татарам пад пагрозай смерці. Створаны гераічны вобраз князя Аляксандра Неўскага, пад умелым кіраўніцтвам якога былі разгромлены шведскія і нямецкія войскі **[2**, с. **75]**. У гэтай главе шмат цікавых звестак пра асабістае жыццё, ваенную і дзяржаўную дзейнасць такіх маскоўскіх князёў, як Дзмітры Данскі, Іаан **III**, Іаан **IV** Грозны, цар Барыс Гадуноў, земскі староста Мінін і ваявода Пажарскі. Аўтар чытанкі асабліва пранікнёна распавядае дзецям пра подзвіг Івана Сусаніна.

Чатыры параграфы прысвечаны Пятру **І.** Спачатку пісьменнік распавядае пра дзіцячыя гады будучага цара, яго гульні і забавы. Гістарычныя тэксты зноў падмацоўваюцца вершамі і старымі песнямі, у якіх праспаўляецца пераўтваральная дзейнасць Пятра. Так, **І.** К. Кандрацьеў уключыў у гэты раздзел верш А. Пушкіна «Петербург» **[2**, с. **92]**.

Самым значным у разглядаемым раздзеле з'яўляецца **§41** - «Айчынная вайна **1812** года». Ён насычаны гістарычнымі звесткамі аб Напалеоне, Аляксандры **І**, французскай і рускай арміях, асноўных бітвах. Навуковы тэкст С. Салаў'ёва дапоўнены знакамітымі вершамі М. Лермантава «Бородино», «Наполеон», А. Пушкіна «Перед гробом Кутузова». Завяршаецца раздзел «Гісторыя» аглядам важнейшых падзей **XIX** стагоддзя: скасаванне прыгоннага права, Крымская вайна, каранаванне Аляксандра **III.** Як і ў папярэдніх параграфах, гістарычны тэкст суседнічае з мастацкім. Кандрацьеў уключае ў параграф верш М. Разенайма «**19** февраля **1861** года» і свой «**15** мая **1883** года», прысвечаны каранацыі новага цара Аляксандра **III.**

Тэксты, якія сабраў і ўключыў у гістарычны раздзел **І.** К. Кандрацьеў, сведчаць: аўтар ставіў мэтай выхаванне ў дзяцей любові да сваёй Радзімы, краю, павагі да герояў, патрыятызму, мужнасці і гатоўнасці абараняць яе цэласнасць і незалежнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Родная прырода

Пісьменнік усведамляў, што вялікае значэнне ў пазнанні дзецьмі навакольнага свету належыць прыродзе. Трэці раздзел чытанкі так і называецца «Прырода». Пісьменнік улічваў дзіцячую ўражлівасць, імкненне асэнсаваць убачанае і пачутае. Таму прапанаваныя для чытання тэксты багатыя яркімі, запамінальнымі вобразамі, якія абуджаюць пачуццё прыгожага, актыўную дзейнасць дзеля захавання расліннага і жывёльнага свету.

Разнастайныя па тэматыцы, гэтыя тэксты згрупіраваны па пэўных тэмах. Першыя параграфы прысвечаны порам года. З дапамогай тэкстаў М. Карамзіна, І. Нікіціна, А. Пушкіна, Ф. Цютчава створаны цудоўныя карціны абуджэння прыроды. Вось, напрыклад, вясна ў апісанні М. Карамзіна: «Душа желает перемены. И звонкий голос жаворонка раздается в высоте воздушной. Сердце трепещет от удовольствия. Солнце быстрыми действиями лучей своих растопляет снежные холмы: вода шумит с гор, и поселянин, как мореплаватель, радостно восклицает: земля! Реки рвут на себе ледяные оковы, пышно выливаются из берегов, и самый маленький ручеек кажется величественным сыном моря. Бледные луга, упитанные благотворной влагой, пушатся свежей травкою и красятся лазоревыми цветами. Березовые рощи зеленеют. За ними дремучие леса, при громком гимне веселых птичек, одеваются листьями, а ветерки повсюду разносят благоухание черемухи» [2, с. 112].

Пейзажнымі вершамі Д. Давыдава, А. Фета, І. Нікіціна малюе аўтар чытанкі паэтычнае аблічча зямлі летам [2, с. 115]. У параграфе пра лета пераважаюць карціны праяў магутнасці прыроды: навальніца, гром, маланка. У раздел уведзены ўрывак з апавядання І. Ганчарова «Навальніца», вершы А. Фета «Летні дождж», Ф. Цютчава «Зарніца» [2, с. 119].

У нарысе «Восень» пісьменнік даводзіць дзецям пранізліва-шчымлівае пачуццё растання з летам, недаўгавечнасці шчасця. Ён раскрывае маленькім чытачам прыкметы восені, паказвае асеннія віды гаспадарчай дзейнасці: «Поворотом лета на осень считается Ильин день 20-го июля. С конца этого месяца начинаются уже холодные росы. С половины августа отлетают ласточки, начинаются осенние утренники, а к концу месяца и заморозки, и тянутся на юг журавли. С 1-го сентября в деревнях начинаются засидки с огнем и посиделки. Время это слывет в народе «бабьим летом». По садам собираются плоды, по огородам - последние овощи. Пчеловод убирает пчел. 1-го октября часто выпадает уже снег. Крестьяне отдыхают, и поэтому в это время по деревням более всего играется свадеб» [2, с. 119].

Зіма падаецца праз тэксты Д. Грыгаровіча, І. Нікіціна, М. Стаховіча. Прырода зімой зусім не тая, але жыццё не спыняецца і ў сцюжу, змяняюцца толькі віды сялянскай працы. І. Кандрацьеў распавядае дзецям, чым займаюцца людзі зімой.

Вобразы пораў года, створаныя Кандрацьевым у чытанцы, адпавядаюць дзіцячаму светаўспрыманню, моцна спалучаюцца з фантастычным і рэальным.

У раздзеле «Прырода» І. К. Кандрацьеў знаёміць дзяцей з флорай і фаўнай Расіі, тлумачыць, для чаго чалавеку патрэбныя лес, вада, палявыя І лугавыя расліны. Шэраг параграфаў раздзела прысвечаны насякомым, птушкам, звярам. Кандрацьеў уводзіць дзяцей у дзівосны свет фаўны, вобразна, праўдзіва, пераканаўча перадае таемнае жыццё дзікіх жывёл, іх звычкі: «Крадется лиса по лесу, крадется она тихонько; все высматривает и вынюхивает, ко всему прислушивается: и капкан обойдет, и от охотника увернется; а сама времени не теряет: то мышку, то жучка словит, то яичко в гнезде выпьет» [2, с. 142].

Вельмі трапна падабраны пісьменнікам вершы, байкі, апавяданні, прымаўкі, якія раскрываюць адметнасці жыцця ваўкоў, мядзведзяў, собаляў, іншых лясных звяроў: «Родился волком, лисицей не бывать», «С волками жить - по волчьи выть», «Не ужиться двум медведям в одной берлоге», «Соколу лес не диво» і інш.

## Звесткі аб розных народах

Цікавы раздзел «Геаграфія». Аўтар чытанкі ярка, эмацыянальна, захапляльна распавядае аб жыцці, занятках, побыце розных народаў, якія насяляюць пэўныя рэгіёны Расіі, паказвае адрозненні ў кліматычных і прыродных умовах. Кожнаму рэгіёну (Паўночны, Паўднёвы, Заходні, Маларосія, Фінляндыя) прысвечаны асобны нарыс. У нарысах пераважае сацыяльная тэматыка. Пісьменнік звяртае ўвагу дзяцей на ўмовы жыцця народаў, што жылі на тэрыторыі Расійскай імперыі. Так, пры апісанні краю, які насялялі беларусы, Кандрацьеў акцэнтуе ўвагу маленькіх чытачоў на беднасці беларускага народа: «Край этот неплодороден и во многих местах покрыт топкими болотами. Так, например, между реками Припетью и Березиной находится обширная местность, покрытая топкими болотами и лиственным лесом и известная под названием Полесья. В такой неплодородной и болотистой местности ни хлебопашество, ни скотоводство не могут прокормить жителей. Вот почему большая часть белорусов вынуждена зарабатывать себе на хлеб на стороне» [2, с. 157].

Мастацкі вобраз рускага, беларускага, украінскага, польскага народаў, фінаў, народаў азіяцкага рэгіёна, увасоблены ў кандрацьеўскіх нарысах, узмацняецца творамі С. Аксакава, Я. Баратынскага, М. Гогаля, М. Загоскіна, І. Нікіціна, А. Талстога. Трэба адзначыць, што аўтар чытанкі не малюе жыццё ў яго сацыяльных супярэчнасцях і неўладкаванасці, а, наадварот, аддае перавагу пазітыўнай танальнасці. Так, да нарыса пра ўкраінцаў пісьменнік далучае верш А. Талстога «Маларосія», у якім ёсць наступныя радкі: *Ты знаешь край, где все обильем дышит, Где реки льются чище серебра, Где ветерок степной ковыль колышет, В вишневых рощах тонут хутора, Среди садов деревья гнутся долу, И до земли висит их плод тяжелый* [2, с. 154].

Гэта і зразумела. Па-першае, з негатыўным сацыяльна-палітычным кантэкстам кнігу для пачатковага чытання цэнзура не дазволіла б апублікаваць. Па-другое, у тэкстах усё ж ёсць латэнтны змест, які апасродкавана падводзіць дзяцей да думкі аб сацыяльнай неўладкаванасці жыцця людзей.

## Сацыяльна-эканамічныя веды

Асабліва сацыяльна-эканамічныя праблемы «прасвечваюцца» з тэкстаў пятага раздзела «Промыслы». Гэтая частка кнігі пачынаецца з верша Ф. Мілера «Песня труда»: *Кто идет во глубь земли, Или молотом махает, Кто сетями для семьи Хлеб насущный добывает, Кто за плугом льет свой пот,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Кто наемник господина, Кто под ношей спину гнет Для жены своей и сына, - Честь и слава всем трудам, Слава каждой капле пота! Честь мозолистым рукам, Да спорится их работа* [2, с. 170].

Гэтым вершам аўтар чытанкі фармулюе галоўную задачу раздзела: выхаваць у дзяцей павагу да чалавека працы. Пісьменнік проста і дакладна вызначае, што з'яўляецца промыслам, вытворчасцю, рамяством: «Добывание природной вещи есть промысел. Охотник промышляет зверя. Когда природную вещь перерабатывают и получают новую вещь, то занимаются производством. Снятую со зверя шкуру выделывают; получается кожа: это кожевенное производство. Производство называется фабричным или заводским, если для переработки материала нужны сложные машины и много рабочих. Таковы бумагопрядильные и ситцевые фабрики, винные и сахарные заводы. Если производство делается не машинами, а с помощью орудий руками, то это называется ремеслом. Таково кузнечное ремесло» [2, с. 169].

І. К. Кандрацьеў лічыў неабходным не толькі даць дзяцям асновы навуковых ведаў аб грамадскай вытворчасці, але і навучыць іх любіць працу, асэнсоўваць матывы чалавечай дзейнасці. Кожнаму віду промыслаў і рамяства прысвечаны асобны нарыс, дзе падрабязна распавядаецца аб матэрыялах, тэхналогіі іх апрацоўкі, канчатковых прадуктах працы, іх выкарыстанні ў побыце. Пісьменнік сцісла, зразумелай для дзяцей мовай знаёміць чытачоў з керамічнай, шкляной, скураной, металургічнай, хімічнай вытворчасцю.

Скразная ідэя нарысаў тая, што праца крыніца маральнага, эстэтычнага і матэрыяльнага задавальнення чалавека. Так, распавядаючы пра промыслы завалжан, аўтар прыводзіць меркаванне П. Мельнікава аб карысці рамяства: «Леса заволжанина кормят. Ложки, плошки, чашки, блюда заволжанин точит да красит; гребни, донца, веретена, и другой щепной товар работает; ведра, ушаты, кадки, лопаты, коробья, весла, лейки, ковши, все что из лесу можно добыть, рук его не минует. Живет заволжанин хоть в труде, да в достатке. С изстари за Волгой мужики в сапогах, бабы в котах. Лаптей видом не видано, хоть слыхом про них слыхано. Изба у него пятистенная, печь с трубой. О черных избах, да соломенных крышах он только слыхал, что есть такие «на горах» [2, с. 166-167].

Старанна Кандрацьевым падабраны мастацкія творы, у якіх увасоблена паэзія сялянскай працы. Дзеці з цікавасцю прачытаюць невялічкія ўрыўкі з твораў С. Аксакава, У. Даля, вершаў А. Кальцова, А. Міцкевіча, І. Нікіціна, М. Някрасава, А. Пляшчэева. Так, напрыклад, паэтыка апрацоўкі поля перадаецца з дапамогай верша М. Някрасава:

*Сын видит, как поле отец удобряет, Как в рыхлую землю бросает зерно, Как поле потом зеленеть начинает,*
*Как колос растет, наливает зерно. Готовую жатву подрежут серпами, Снопы перевяжут, на ригу свезут, Просушат, колотят, колотят цепами, На мельнице смелют и хлеб испекут* [2, с. 181].

У гэтым раздзеле І. К. Кандрацьеў дае цікавыя падрабязнасці працоўнага жыцця народа, праўдзіва, з улікам узроставых асаблівасцей чытачоў апісвае цяжкую, але мэтазгодную, без якой немагчыма існаванне грамадства, працу рабочых, рамеснікаў, сялян. На гэта скіраваны і ўключаныя ў раздзел пагаворкі: «Доход не живет без хлопот», «У кузнеца, что стук - то гривна», «Чтобы рыбку съесть, надо в волны лезть», «Кто не ленив пахать, тот будет богат» і інш. Пісьменнік пераконвае дзяцей, што якой бы цяжкай ні была праца, яна служыць высакароднай мэце, калі прыносіць радасць і шчасце працаўніку.

## Абуджэнне творчай думкі

У тэкстах, якія склалі кнігу для пачатковага чытання, нямала твораў не толькі філасофска-сузіральных, але і заснаваных на дасягненнях прыродазнаўчых навук. Асабліва багаты на іх апошні раздзел, які аўтар назваў «Агульны». У грунтоўным нарысе І. К. Кандрацьеў знаёміць юных чытачоў з вынаходніцтвам кнігадрукавання, гісторыяй кнігі. Выкарыстанню чалавекам энергіі пара прысвячаны нарыс і верш «Чыгунка». Укладальнік на канкрэтных прыкладах паказвае дзецям значэнне паравых рухавікоў у вытворчасці. У раздзеле тлумачацца многія з'явы свету, якасці і ўласцівасці асобных матэрыялаў, з якіх вырабляюцца прылады працы. Так, з нарыса «Што на што карысна» дзеці даведваюцца, чаму не з дуба, а з бярозы выразаюцца ступіцы і падушкі пад калёсы, чаму палазы для саней гнуць з дуба і вяза, а не з бярозы і ліпы. Тлумачыць І. К. Кандрацьеў юным чытачам і тое, ад чаго на марозе трашчаць дрэвы, што такое вільгаць, нястача, міласэрнасць, дабрачыннасць і г. д.

Такім чынам, гутарка з дзецьмі аб прадметах і з'явах добра ім знаёмых з паўсядзённага жыцця на падставе дадзеных навукі садзейнічае фарміраванню правільнага светаразумення, засваенню пэўных ведаў, абуджае творчую думку.

Усе раздзелы кнігі і асабліва апошні насычаны творамі славянскай вуснай народнай творчасці: казкамі, народнымі апавяданнямі, песнямі, байкамі, загадкамі, прымаўкамі, якія праслаўляюць жыццёвую сілу чалавека, напоўнены верай у яго перамогу над сіламі зла. Вусная народная творчасць як бы паэтызуе тое, аб чым ідзе гаворка ў празаічных творах. Пры гэтым лагічнае мысленне дзяцей зрастаецца з цудоўнымі паэтычнымі вобразамі, развіццё розуму ідзе поруч з развіццём фантазіі і эмоцый. Аўтар чытанкі не толькі апелюваў да дзіцячага розуму, але і абапіраўся на ўяўленні і пачуцці юных чытачоў. Засваенню разнапланавага зместу кнігі садзейнічаюць шматлікія алеаграфічныя малюнкі, прымеркаваныя да адпаведных тэм.

Мудрая, ясная, захапляльная чытанка Кандрацьева, нашага таленавітага суайчынніка, адкрыла не аднаму пакаленню дзяцей розных нацыянальнасцей цудоўны, поўны таямніц свет прыроды, грамадства, культуры. Думаецца, што па ёй у свой час вучыліся чытаць Элаіза Пашкевіч (Цётка), Карусь Каганец, Якуб Колас. ЦІ не кандрацьеўская кніга для пачатковага чытання «Іскра Божая» навяла іх на думку стварыць для дзетак беларусаў кнігу «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання» (К. Каганец), «Первое чтение для деток белорусов» (Цётка) І «Второе чтение для детей белорусов» (Я. Колас). Не страціла кніга І. К. Кандрацьева сваёй актуальнасці і ў наш звышцывілізаваны, прагматычны век, калі так не хапае духоўнасці, спагады, міласэрнасці, дабрыні і шчырасці ў адносінах паміж людзьмі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЛІТАРАТУРА


1. Кондратьев, И. К. Русские народные былины: Вып. 1 / И. К. Кондратьев. - М.: Издание П. И. Щеглова, 1884. - 67 с.
2. Кондратьев, И. К. Искра Божия: книга для начального чтения / И. К. Кондратьев. - М.: Издание П. И. Щеглова, 1887. - 224 с.
3. Кондратьев, И. К. Золотая струна: ориг. сказочки, стишки и рассказцы / И.К. Кондратьев. - М.: тип. И. Д. Сытина и К, 1891. - 53 с.
4. Кондратьев, И. К. Снегурочка: весен, сказка в стихах, рассказ. И. К. К-вым / И. К. Кондратьев. - М.: Н. П. Барков, 1894. - 24 с.
5. Кондратьев, И. К. Сивка-Бурка вещая каурка: ориг. рус. нар. сказка / И. К. Кондратьев. - М.: Н. П. Барков, 1894. - 28 с.
6. Кондратьев, И. К. В дружбе с природой: рус. книжка для первонач. чтения / сост. И. Погорелин [псевд.]. - М.: тип-лит. т-ва И. Н. Кушнеров и К, 1896. - 43 с.
7. Кондратьев, И. К. Полный самоучитель русской азбуки в зоологических картинах / сост. И. К-ъ; И. К. Кондратьев. - М.: типлитогр. И. Е. Ермакова, 1896. - 114 с.
8. Кондратьев, И. К. Лото племен и народов: этногр. игра для детей, состоящая из 12 карт, со 144 назв. раз- лич. племен с описанием их быта, нравов, обычаев и религии / сост. И. К. Кондратьев. - М.: тип. Виль- де, 1897. - 105 с.
9. Кондратьев, И. К. Степка-растрепка: похождение одного неисправимого шалуна / рассказал И. К-ев; И. К. Кондратьев. - М.: т/д Е. Коновалова и К, 1914. - 23 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ